КАНКРЭТНЫЯ РАШЭННІ

Таму што для такой аперацыі немаўля павінна важыць хоць бы два з паловай кілаграмы.

Яшчэ прыклад — не так даўно жанчына, якая два месяцы знаходзілася пасля аварыі ў коме, нарадзіла здаровае дзіця. Урачы выратавалі і маму, і малога. Сапраўды, такія выпадкі ўваходзяць у гісторыю медыцыны.

Пра затрыманні медыкаў

Разам з тым Аляксандр Лукашэнка пракаментаваў сітуацыю з затрыманнямі ў медыцынскай сферы: «Саджалі і будзем саджаць за тое, што яны робяць».

Паводле яго слоў, затрыманыя — гэта зладзеі і хабарнікі, перш за ўсё, кіраўнікі ўстаноў. Звычайныя хірургі штодня ратуюць жыцці, а за іх спінай пастаўляюць медыцынскае абсталяванне, лекі з вялізнымі нацэнкамі, грошы за якія трапляюць у кішэню кіраўніцтва. «Таму не трэба пакутаваць, што Лукашэнка перасаджаў», — падкрэсліў ён.

Кіраўнік дзяржавы сфармуляваў простую формулу: не крадзіце ў людзей, дзяржавы, не бярыце чужога. І ўсё будзе нармальна — чалавек будзе на волі.

Ён нагадаў пра сітуацыю, калі ў аднаго з затрыманых у гаражы — за двайной сценкай — знайшлі склад валюты. Паводле слоў беларускага лідара, той сказаў, што яму падарылі — нехта з Расіі прывёз, нехта з ЗША. «Гэтага быць не павінна, не трэба на мяне за гэта крыўдзіцца. Даравання за гэта не будзе нікому», — падкрэсліў ён.

...У працяг тэмы здароўя Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ініцыятыва «Здаровыя гарады і пасёлкі» павінна перарасці ў маштабны дзяржаўны праект. Усе населеныя пункты краіны, якія прэтэндуюць на званне здаровага горада ці пасёлка, павінны атрымаць паўнавартаснае здароўезберагальнае асяроддзе. Без курэння і алкаголю, са спартыўнымі пляцоўкамі, бяспечнымі ўмовамі жыцця, чыстай вадой і паветрам.

Спорт — гэта наша ідэалогія

«Здароўе нацыі — гэта клопат не толькі медыкаў, але і кожнага з нас», — акцэнтаваў беларускі лідар.

Без фізічнай актыўнасці, заняткаў спортам не будзе здаровых дзяцей, здаровых людзей, здаровай нацыі ў цэлым. Увага дзяржавы да гэтай тэмы заўсёды самая пільная.

«І перш за ўсё мы самі павінны паказваць прыклад здаровага ладу жыцця, таксама знаходзіць у сваім графіку час для заняткаў спортам. Прысутнічаць на спартыўных мерапрыемствах. Спорт — гэта наша ідэалогія», — дадаў ён.

Узняцце Дзяржаўнага сцяга, выкананне Дзяржаўнага гімна ў гонар нашых спартсменаў умацоўваюць аўтарытэт Беларусі на міжнароднай арэне, але галоўнае, абуджаюць у сэрцах мільёнаў беларусаў пачуццё гонару за Радзіму, упэўнены кіраўнік дзяржавы.

Для развіцця спорту ў нашай краіне зроблена ўсё і нават больш.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: неабходныя даручэнні па рашэнні канкрэтных сістэмных пытанняў дадзены, прыярытэты расстаўленыя. Ад спартсменаў патрабуецца адно — даць вынік і не спасылацца на тое, што чагосьці не хапае, таму што раней умовы былі значна горшыя.

«І ў нашых дзяцей павінны быць найлепшыя ўмовы для заняткаў спортам. Спартыўныя школы да першага ліпеня трэба забяспечыць неабходным інвентаром і абсталяваннем, прычым нашай айчыннай вытворчасці, мы ўсе гэта ўмеем рабіць, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта задача ўраду, старшыням аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама. Разам несяце персанальную адказнасць. Акрамя таго, яшчэ раз па-гаспадарску паглядзіце на школьныя стадыёны, спартыўныя дваровыя пляцоўкі і веладарожкі».

Кіраўнік дзяржавы расказаў, што нядаўна на пасяджэнні выканкама НАК даў даручэнне губернатарам — падняць і ўтрымліваць канкрэтныя каманды. Выказаўся ён і з нагоды заробкаў у некаторых відах спорту: вядома, за зарплату ў 300 рублёў спортам мала хто будзе займацца. Такая сітуацыя назіралася ў гандболе — тады ён даручыў, каб у спартсмена, які гуляе ў першынстве краіны, зарплата была не ніжэйшая за сярэднюю па Беларусі. Астатняе — за вынік. Пры гэтым Прэзідэнт падкрэсліў: ён супраць «дзікіх» заробкаў, як у хакейным «Дынама». Дарэчы, будучыня гэтай каманды можа апынуцца пад пытаннем у выпадку, калі яна працягне так дрэнна выступаць.

Акрамя таго, літаральна пара месяцаў аддзяляе нас ад маштабнай падзеі — Другіх Еўрапейскіх гульняў. А восенню адбудзецца лёгкаатлетычны матч Еўропа — ЗША. «Гэта экзамен не толькі для спартсменаў, гэта магчымасць чарговы раз паказаць усяму свету нашу прыгожую, багатую культурнымі традыцыямі Беларусь і паказаць вынікі», — дадаў беларускі лідар.

Турыстычны патэнцыял — на максімум

«У нашай нацыянальнай культуры заключаны каласальныя духоўныя багацці. Гэта наш маральны стрыжань. Ён дапамагае захаваць самабытнасць. Сёння, калі звонку нам навязваюцца нейкія асярэдненыя каштоўнасці, якія нараджаюць безгустоўшчыну, бездухоўнасць, гэта для нас асабліва важна», — адзначыў Прэзідэнт.

Паказаць сваё багацце, захаваць свае ідэалы, пачуццё ўласнай годнасці — значыць захаваць сілу краіны, яе незалежнасць, упэўнены ён. Па словах кіраўніка дзяржавы, мы павінны зрабіць усё для таго, каб зберагчы і прымножыць нашу культурную спадчыну, выхаваць на ёй новыя пакаленні.

«Паглядзіце, колькі талентаў дала Беларусь усяму свету. Беларусь, безумоўна, — краіна таленавітых людзей. Умовы для раскрыцця і рэалізацыі творчага патэнцыялу ў нас створаны. Працуюць розныя фонды і праграмы падтрымкі. Дзяржава ўклала нямалыя сродкі ў рэканструкцыю аб'ектаў культуры», — нагадаў беларускі лідар.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, наш народ вельмі ўспрымальны да творчасці, да мастацтва, да ўсяго прыгожага. Міжнародныя форумы, фестывалі, канцэрты ў нашай краіне заўсёды праходзяць з аншлагам.

«Міністэрству спорту і турызму трэба максімальна выкарыстоўваць увесь існуючы турыстычны патэнцыял краіны, — падкрэсліў ён. — Так, усё ведаюць Белавежскую пушчу, Брэсцкую крэпасць, саборы і музеі Полацка. А як жа Лідскі і Косаўскі замкі, пышная архітэктура Пінска і многае іншае?»

Прэзідэнт упэўнены: гэтыя аб'екты таксама павінны стаць часткай турыстычнага бізнесу.

Каму гэта нявыгадна?

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што Беларусь сёння цікавая не толькі з пункту гледжання турызму. Яна камфортная для жыцця, бяспечная, утульная, прыгожая.

Але захоўваць нашу ўнутраную раўнавагу, знаходзячыся на геаграфічным скрыжаванні Еўропы, на стыку геапалітычных інтарэсаў буйных сусветных дзяржаў і саюзаў, вельмі няпроста — і гэта прыярытэтная задача беларускай дыпламатыі.

«Мы памятаем урокі мінулага. Аналізуем актуальнае міжнароднае становішча. Сёння яно аб'ектыўна ўскладняецца. Таму робім усё, каб не апынуцца на вастрыі блокавага супрацьстаяння паміж Усходам і Захадам і перасцерагчы свет ад новага цывілізацыйнага разлому. У гэтым заключаецца галоўная мэта нашай знешняй палітыкі, нашых мірных ініцыятыў па збліжэнні розных інтэграцыйных фарматаў, а па павышэнні даверу і бяспекі», — сказаў Прэзідэнт.

Вядома, за Мінскам замацаваўся статус нейтральнай перамоўнай пляцоўкі для кантактаў па самых цяжкіх пытаннях міжнароднага парадку дня. Мы цэнім і ганарымся гэтым, сёння мы робім усё магчымае для таго, каб на блізкую нам украінскую зямлю вярнуліся мір і згода, дадаў кіраўнік дзяржавы. Гэта нас хвалюе ў тым ліку таму, што ўсё адбываецца зусім побач, каля нашага парога.

«Пераадолець існуючыя супярэчнасці на планеце, у тым ліку на агульнай прасторы Еўра-Атлантыкі, можна толькі пачаўшы шырокі стратэгічны дыялог. Будзе гэта называцца «Хельсінкі-2» ці неяк інакш — не мае значэння. Галоўнае, каб быў вынік», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка зноў паўтарыў: нельга, каб гінулі людзі.

Нягледзячы на тое, што ва Украіне фактычна ідзе вайна, кіраўнікі дзяржаў не могуць сабрацца і абмеркаваць сітуацыю. Чаму? «Бо камусьці гэта нявыгадна, каму — вы самі можаце здагадацца», — сказаў ён.

Пакуль усё бядуюць — і ў тых жа СМІ — трэба сабрацца і спыніць гэта, упэўнены кіраўнік дзяржавы.

«Для нас жыццёва неабходна захаванне мірнай, паспяховай Еўропы — нашага агульнага дома. Да гэтага сёння і мы заклікаем усіх нашых партнёраў, — падкрэсліў Прэзідэнт. — На ўсходзе нашы намаганні накіраваны на актыўны ўдзел у інтэграцыйных аб'яднаннях на постсавецкай прасторы. Мы нязменна рушым па ўзятым 20 гадоў таму курсе на стварэнне Саюзнай дзяржавы. У ліку нашых прыярытэтаў застаецца супрацоўніцтва ў рамках СНД».

Ён таксама адзначыў, што Беларусь гатова адыгрываць больш значную ролю гандлёвага канала для шматмільённага рынку ЕАЭС і краін СНД, а таксама Еўрасаюза. Інтэграцыя дзеля інтэграцыі не важная, трэба дасягаць мэт, якія дадуць адчувальны вынік. Паводле яго слоў, ЕАЭС павінен стаць паўнавартасным эканамічным саюзам з роўнымі ўмовамі для яго ўдзельнікаў. Рашэнне гэтай задачы будзе прыярытэтам старшынства Беларусі ў арганізацыі ў 2020 годзе.

Стаўка на высокадаходныя тавары і паслугі

«Мы не валодаем вялікімі запасамі сыравінных рэсурсаў, таму тым больш павінны рабіць стаўку на экспарт высокадаходных тавараў і паслуг. Але сёння мала проста вырабіць добры тавар і знайсці рынак збыту. Сусветны гандаль, на жаль, становіцца закладнікам палітычных манеўраў», — заключыў Аляксандр Лукашэнка.

Мінулы год Прэзідэнт назваў годам гандлёвых войнаў. «І ў бягучым годзе яны працягваюцца. Гэта не толькі санкцыйнае супрацьстаянне. Выкарыстоўваецца шырокі арсенал недапушчальных мер — ціск, дыскрымінацыя, шантаж, забароны, — звярнуў ён увагу. — Некаторыя краіны ўвялі аднабаковыя абмежаванні ў гандлі нават у дачыненні да сваіх найважнейшых, найбліжэйшых знешнеэканамічных партнёраў. У тым ліку, як вы ведаеце, і ў адносінах да Беларусі».

Паводле слоў Лукашэнкі, найважнейшай задачай для краіны застаецца развіццё экспарту. «Пры гэтым высокая доля знешнегандлёвага тавараабароту не толькі прыносіць плён, але і фарміруе рызыку залежнасці ад знешняй кан'юнктуры», — заўважыў ён.

«Таму так важна знайсці свае нішы на сусветным рынку, вырабляць тавары і аказваць паслугі, якія маюць устойлівы попыт, высокую канкурэнтаздольнасць, стабільную рэнтабельнасць», — сказаў Лукашэнка, дадаўшы, што ўрад павінен прапаноўваць эфектыўныя, запатрабаваныя інструменты падтрымкі экспарту.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

НАТА каля нашай мяжы

«Новую рэальнасць, мякка кажучы, некамфортную для ўсёй сусветнай супольнасці, стварае напружанасць палітычнага дыялогу найбуйнейшых сусветных дзяржаў — ЗША, Кітая, часткова Індыі і Расіі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Ламаюцца механізмы глабальнага стрымлівання, а намер ЗША выйсці з Дагавора аб ліквідацыі ракет сярэдняй і меншай далёкасці пагражае непрадказальнымі наступствамі», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы.

«Нас не можа не турбаваць узмацненне ваенных сіл НАТА і ЗША ў суседніх дзяржавах. Гэта рэаліі, якія патрабуюць умацавання Узброеных Сіл Беларусі, прыняцця мер для забеспячэння нашай бяспекі», — адзначыў беларускі лідар.

Прэзідэнт расказаў, што Беларусь, удасканальваючы абараназдольнасць, наколькі магчыма развівае ўзаемадзеянне ў фармаце АДКБ, прымае ўдзел у манеўрах, павышае эфектыўнасць рэгіянальнай групоўкі войскаў. Сумесна з Расіяй краіна рыхтуецца да правядзення вучэнняў «Шчыт Саюза — 2019».

Пагрозы — у інфармацыйнай прасторы

Камунікацыйныя тэхналогіі ў Беларусі развіваюцца актыўна — у 2018 годзе па гэтым паказчыку краіна заняла 38-е месца з амаль 200 дзяржаў. Разам з тым тэхналагічнасць адкрывае і новыя магчымасці для злачыннага ўмяшання, несанкцыянаванага атрымання і выкарыстання даных, у тым ліку асабістых. «Летась колькасць выяўленых кіберзлачынстваў вырасла ў 1,5 раза», — звярнуў увагу Прэзідэнт.

Адказныя вектары дзяржаўнай палітыкі пазначаны ў нядаўна прынятай Канцэпцыі інфармацыйнай бяспекі. Аляксандр Лукашэнка заявіў, што патрэбны канкрэтныя крокі па яе рэалізацыі. Гэта задача для Дзяржаўнага сакратарыята Савета бяспекі і адпаведных міністэрстваў і ведамстваў.

Кіраўнік дзяржавы таксама закрануў пытанні барацьбы са злачыннасцю і правапарушэннямі.

«У цэлым грамадскі парадак і спакой грамадзян у краіне забяспечваюцца на належным узроўні дзякуючы нашай міліцыі, Камітэту дзяржаўнай бяспекі і іншым. Праваахоўныя органы трымаюць сітуацыю пад кантролем. Колькасць асабліва цяжкіх злачынстваў за апошнія чатыры гады зменшылася амаль на чвэрць. У любой частцы Беларусі людзі могуць спакойна жыць і працаваць, не асцерагаючыся за ўласную бяспеку», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Новыя антыкарупцыйныя меры

«Па маім даручэнні летась праведзены пасяджэнні аблвыканкамаў па пытанні процідзеяння карупцыі. Мы ўсіх папярэдзілі знізу даверху. Выпрацаваны канкрэтныя прапановы па павышэнні адказнасці за сітуацыю ў гэтай сферы на ўсіх узроўнях кіравання. Генеральнай пракуратуры, якую я не вельмі бачу ў барацьбе з карупцыяй, — падрыхтаваць комплекс мер па ліквідацыі прычын і ўмоў, якія параджаюць карупцыю», — даручыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што беларускае заканадаўства аб барацьбе з карупцыяй з'яўляецца адным з самых суровых у плане санкцый, якія ўжываюцца да парушальнікаў. Работа па супрацьдзеянні карупцыйным праявам вядзецца на сістэмнай аснове, а яе вынікі максімальна адкрытыя.

«Але, як паказвае практыка, нягледзячы на найсур'ёзнейшыя меры адказнасці, пакуль яшчэ не да ўсіх дайшла простая ісціна аб катэгарычнай недапушчальнасці хабарніцтва і казнакрадства. Пры гэтым маштаб выяўленых злачынных схем не можа не насцярожваць і патрабуе ад нас прыняцця дадатковых мер барацьбы з падобнымі дзеяннямі», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы яшчэ раз падкрэсліў, што важная якасная прафілактычная работа, асабліва ў тых сферах, дзе карупцыйныя рызыкі найбольш высокія. Гэта галоўная задача не толькі для праваахоўнікаў, але і для кіраўнікоў ва ўсіх галінах эканомікі.

Акрамя таго, Прэзідэнт лічыць, што ёсць неабходнасць сфарміраваць у людзей нецярпімае стаўленне да карупцыі ва ўсіх яе формах і праявах, больш актыўна ўключаць у дзейнасць шырокія пласты насельніцтва.

«Попыт на справядлівасць у нашым грамадстве заўсёды быў высокі, і сёння ён не стаў ніжэйшы. Я ўжо прыводзіў у прыклад Расію, Украіну, суседнія, заходнія дзяржавы, ды і іншыя, дзе на сцягах тых, хто выступае на дэманстрацыях, напісана адно слова — «справядлівасць». Нас Гасподзь штурхнуў на гэтую сцежку барацьбы за справядлівасць з першых дзён майго прэзідэнцтва. Як бачыце, гэты тэзіс сёння запатрабаваны як ніколі», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Прапановы закрыць інтэрнэт — лухта

Прэзідэнт звярнуў увагу на нарастаючы знешні і ўнутраны медыяціск. На яго думку, сітуацыя даўно патрабуе прыняцця рашучых мер па ўмацаванні інфармацыйнай бяспекі краіны.

У першую чаргу гэта датычыцца інтэрнэту — асноўнай крыніцы інфармацыі для большасці людзей, і асабліва непакоіць масавае распаўсюджванне там адкрыта лжывай і правакацыйнай інфармацыі. Разам з тым кіраўнік дзяржавы супраць прапаноў закрыць інтэрнэт.

«Да мяне прыходзяць розныя людзі з прапановамі накшталт «закрыць» інтэрнэт, прапануюць нейкі асобны інтэрнэт стварыць — гэта ўсё лухта», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Замест «закрыцця» кіраўнік дзяржавы заклікаў чыноўнікаў лепш працаваць у інтэрнэце. «Вы там яшчэ не былі і не працавалі, а ўжо прапануеце ўсё закрыць, усіх задушыць, усіх выкінуць», — сказаў ён. Замест гэтага кіраўнік дзяржавы параіў звярнуць увагу на рознага кшталту старонкі, у тым ліку ў сацыяльных сетках. «Тут і суседзі нам «дапамагаюць», і тыя, хто ў Беларусь прыехаў працаваць. Вось тым трэба спачатку мазгі ўправіць. Прыехаў у краіну — працуй як трэба, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Змагаемся не з тымі, з кім трэба змагацца, і не тымі метадамі».

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Прыйшоў у школу — адпрацуй як мае быць

Беларускі лідар яшчэ раз падкрэсліў немэтазгоднасць увядзення ў школах пасад намесніка дырэктара па бяспецы, ахоўнікаў або дадатковых ставак школьных псіхолагаў. «Мы ўвядзём гэтых начальнікаў па бяспецы, яны будуць атрымліваць грошы — невядома адкуль, ад настаўнікаў мы іх возьмем? А ўсе астатнія будуць адхіленыя ад гэтай работы. І ён адзін забяспечыць у школе бяспеку? — спытаў кіраўнік дзяржавы. — Гэта наша бязладдзе, наша недысцыплінаванасць і расхлябанасць у школе — вось што прыводзіць да гэтага. І не трэба пажар тушыць бензінам».

Прэзідэнт падкрэсліў, што кожны педагог павінен быць адначасова і псіхолагам, і ідэолагам. У сувязі з гэтым ён запатрабаваў, каб у школах настаўнікі і кіраўнікі больш якасна выконвалі свае абавязкі. «Якія яшчэ моладзі патрэбныя псіхолагі, калі там першы псіхолаг — дырэктар, два, а дзесьці і тры намеснікі дырэктара, дзе класныя кіраўнікі — псіхолагі. Вы што, у школе не вучыліся, у рэшце рэшт? Якія начальнікі па бяспецы? Прыйшоў у школу — адпрацуй як мае быць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Беларуская армія — сучасная

«Беларуская армія адпавядае ўсім сучасным патрабаванням, задачам дзяржаўнай палітыкі, здольная супрацьстаяць любым пагрозам», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў краіне працягваюць развіваць уласную вытворчасць спецыялізаванай і баявой тэхнікі. Сярод дасягненняў айчыннага ВПК — рэактыўная сістэма залпавага агню, новы зенітна-ракетны комплекс сярэдняй далёкасці, сродкі барацьбы з беспілотнікамі, якія карыстаюцца попытам у войсках шматлікіх краін свету. На стадыі завяршэння — работы па стварэнні супрацьтанкавых ракетных комплексаў. Ужо пачаліся выпрабаванні ўдарных беспілотных авіяцыйных комплексаў, у войскі пастаўляюцца айчынныя лёгкабраніраваныя аўтамабілі для сіл хуткага рэагавання.

«Але галоўнае ў ваеннай арганізацыі — гэта людзі. Мір і бяспеку Беларусі забяспечваюць адукаваныя, высокапрафесійныя, верныя абавязку вайскоўцы. Задача Мінабароны — павышаць прэстыж ваеннай службы, ствараць сістэму пераваг для маладых людзей, якія прайшлі вайсковую школу, выхоўваць патрыётаў, заўсёды гатовых стаць на абарону інтарэсаў нашай Айчыны», — заключыў Аляксандр Лукашэнка.

Пра Канстытуцыю ў цяперашнім выглядзе

«Перакананы, што ўзважаная і прадуманая работа экспертнай супольнасці прывядзе да стварэння абноўленага закона, які адпавядае інтарэсам нашай краіны і нашых грамадзян на сучасным этапе», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што пакінуць Канстытуцыю ў цяперашнім выглядзе свайму пераемніку ён не хацеў бы: «Мы прайшлі той этап, калі нам патрэбна была моцная ўлада — вось такая, як у нас ёсць. Трэба не ўладай дзяліцца. Улада непадзельная. Трэба нагружаць уладнымі паўнамоцтвамі іншыя структуры і галіны ўлады. Каб за эканоміку, напрыклад, адказваў урад разам з парламентам. Нацыянальны банк не павінен быць убаку. Кантроль будзе ажыццяўляцца па розных кірунках — у нас ужо варыянты адпрацаваны — той жа Камітэт дзяржкантролю, іншыя міністэрствы і ведамствы».

«Што датычыцца будучага кіраўніка дзяржавы, ён павінен быць сапраўды кіраўніком дзяржавы, ён не павінен так шмат матацца па палях і фермах. Я нядаўна папракнуў урад: слухайце, людзі не бачаць вас там, на фермах, на палях», — падзяліўся меркаваннем Прэзідэнт.

«Але гэта не значыць, што мы будзем прадпрымаць нейкую спробу стварыць такую сістэму, што Лукашэнка быццам сышоў і не сышоў. Гэтага ў краіне не будзе. Я вам дакладна абяцаю», — заявіў беларускі лідар.

«Я думаю пра будучыню сваёй краіны, а не пра сваё асабістую ўладу. Слухайце, я ўжо наўладарыў. Перастаньце пра гэта пісаць. Тыя, хто так думае, — некампетэнтныя людзі», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Парламенцкія выбары ў 2019-м...

«Сёлета адбудуцца выбары ў Палату прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі. Яны стануць экзаменам не толькі для кандыдатаў у дэпутаты і ўсёй вертыкалі ўлады, але і для кожнага выбаршчыка», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што дата пакуль не вызначана, але калі гэта прымальна па законе, то выбары можна было б прымеркаваць да Дня Кастрычніцкай рэвалюцыі. «Ёсць добрае свята 7 лістапада — выхадны дзень. Па-мойму, прымальна. Давайце будзем да гэтай даты блізка арыентавацца без усялякіх ідэалагічных пасылаў», — сказаў Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў, што ў розных людзей могуць быць розныя погляды на падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі, але гэта было ў гісторыі, і адмаўляцца ад гэтага нельга. Больш за тое, гэта свайго роду ўрок, што можа адбыцца, калі краіна ўцягнутая ў войны і даведзеная да галечы. «Гэта народ перавярнуў краіну. Ён не захацеў жыць у гэтай сістэме. Гэта для нас урок. І яшчэ шмат людзей, якія адзначаюць гэтае свята, жывуць ім. Гасподзь з імі, чаму мы павінны быць супраць. Таму калі гэта прымальна, давайце арыентавацца на гэтую дату. Я абяцаю вам, што ў найбліжэйшы час па законе будзе прынята адпаведнае рашэнне», — заявіў беларускі лідар.

«Краіне патрэбны дзейсны, актыўны, моцны парламент, у якім павінна быць прадстаўлена моладзь, ветэранам павінна быць дадзена магчымасць пазмагацца. І не трэба баяцца вылучаць свае кандыдатуры, змагацца ад партый, арганізацый. Гэта і ёсць перадвыбарчая кампанія, гэта і ёсць выбары, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Але толькі без глупстваў, без забору крыві, без дэбатаў на стадыёнах і іншага. Ідзіце да людзей. Там асноўны фронт палітычнай барацьбы».

Аляксандр Лукашэнка асабліва падкрэсліў ролю будучага складу парламента: «Нам патрэбны вельмі таленавіты парламент. Таму што ён стане эпіцэнтрам выпрацоўкі Асноўнага Закона разам з Прэзідэнтам. Нам — будучым парламентарыям і мне — наканавана паставіць канчатковую кропку ў абноўленай Канстытуцыі нашай краіны».

Беларускі лідар упэўнены, што парламентарыі, як ніхто іншы, павінны тонка адчуваць настроі грамадства, ведаць патрэбы выбаршчыкаў і рэагаваць на іх, працаваць на адзіную мэту — пабудова дзяржавы для народа.

«У Беларусі — народная ўлада. Яна жыве рэальнымі клопатамі людзей, а не асабістымі эканамічнымі інтарэсамі і амбіцыямі палітыкаў. У Авальнай зале павінен весціся канструктыўны дыялог з тымі, хто незалежна ад палітычных поглядаў, меркаванняў або пазіцый стаіць на варце інтарэсаў народа і бачыць нашу краіну свабоднай, міралюбівай, мірнай і моцнай», — рэзюмаваў беларускі лідар.

...і прэзідэнцкія ў 2020 годзе

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што палітычна актыўную частку грамадства хвалюе пытанне маючых адбыцца выбарчых кампаній: «Не ведаю, чаму раптам гэта стала нейкай тэмай для спрэчак. У нас ёсць закон, Канстытуцыя. Вы выдатна разумееце, што я не буду тут круціць-вярцець і шукаць якую-небудзь выгаду для захавання ўлады. Некаторыя так званыя палітыкі прапануюць правесці выбары Прэзідэнта сёлета, спасылаюцца на стабільную эканамічную сітуацыю, больш-менш спрыяльныя ўмовы».

«Зноў паўтару: не будзем падладжвацца пад якія-небудзь выгадныя фактары, арыентавацца на нейкі зручны момант. Прэзідэнцкія выбары павінны адбыцца ў 2020 годзе. У 2020 годзе яны і пройдуць, што б ні здарылася ў нашай краіне. Мы не будзем гуляць з народам, ладзіць палітычныя гульні пад нейкую адну фігуру. Прэзідэнцкія выбары пройдуць у строгай адпаведнасці з законам ва ўстаноўленыя Канстытуцыяй тэрміны», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Беларусь адбылася як незалежная дзяржава

Напрыканцы прамовы Аляксандр Лукашэнка заўважыў: «Захаваць суверэнітэт, мір, спакойнае стваральнае жыццё на сваёй зямлі — наш святы абавязак. Каб выканаць гэтую падораную нам лёсам гістарычную місію, мы павінны канчаткова ўсвядоміць сваё нацыянальнае адзінства».

Ён падкрэсліў, што менавіта разам грамадзяне ствараюць сучасную гісторыю беларускага народа і ў год 25-годдзя Канстытуцыі могуць з упэўненасцю канстатаваць — Беларусь як незалежная дзяржава адбылася.

«Прытрымліваючыся розных рэлігій — мы адзіныя ў веры; гаворачы на дзвюх дзяржаўных мовах — мы адна нацыя; абапіраючыся на досвед мінулага — разам ствараем і будзем ствараць будучыню. Мы — народ суверэннай Беларусі, моцнай і квітнеючай краіны, міралюбівай і адкрытай усяму свету!» — заключыў Аляксандр Лукашэнка.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.
Марыя ДАДАЛКА.
Дзмітрый СУГАНЯЕЎ.

ПРА ШТО ПЫТАЛІ ПАРЛАМЕНТАРЫІ

Пасля Паслання парламентарыі мелі магчымасць непасрэдна задаць свае пытанні кіраўніку дзяржавы.

Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы Ігар МАРЗАЛЮК *прапанаваў разгледзець пытанне аб усталяванні 5 чэрвеня свята — Дня беларускай дзяржаўнасці. «У гэты дзень вернікі адзначаюць дзень памяці Ефрасінні Полацкай. А Полацк — гэта не толькі калыска беларускай дзяржаўнасці, але і малая радзіма ўсіх беларусаў, усёй нацыі, горад, «дзе пачынаецца краіна», — аргументаваў дэпутат.*

Прэзідэнт пагадзіўся, што Полацк, як Кіеў і Ноўгарад, — калыска славянскіх народаў, і прапанова дэпутата цікавая. «Давайце разам падумаем над гэтым, — прапанаваў ён. — Пытанне вельмі актуальнае і цікавае з пункту погляду таго, каб паказаць свету, што нашы землі беларускія найстаражытнейшыя, і дзяржаўнасць да нас прыходзіла шмат разоў. І мы стваралі дзяржаўныя нарматыўна-прававыя акты ў гэтым рэгіёне першымі, і кнігі друкавалі, і героі ў нас ёсць сапраўдныя беларускія. Гэта правільна. Трэнд такі існуе. Гэты крэн нашай палітыкі верны, не ў папрок камусьці, мы гэта будзем рабіць і ў гэтым плане падумаем над вашым пытаннем».

Галіна МЕЛЬНІКАВА, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, *звярнула ўвагу, што рэалізацыя Указаў ад 6 студзеня 2012 года № 13 аб аказанні дзяржаўнай падтрымкі пры будаўніцтве або набыцці жыллёвых памяшканняў і ад 4 ліпеня 2017 года № 240 на куплю жылля ў сельскай мясцовасці мае адваротны бок: шматдзетныя сем'і з сельскай мясцовасці пераязджаюць у горад, каб палепшыць свае жыллёвыя ўмовы.*

«Можа, нам памяняць кірунак дапамогі і зрабіць так, каб гараджане паехалі ў вёску ў катэджы, якія мы там будуем?» — спытала яна. Парламентарый таксама нагадала пра дамы ў сельскай мясцовасці, якія шматдзетныя сем'і маглі б набыць гатовымі для пражывання і самі іх рэканструяваць.

Кіраўнік дзяржавы пагадзіўся, што тэма закранута вельмі важная. «Крытэрый адзін: мы не проста павінны дапамагаць набыць жыллё ў вёсцы, мы павінны перш за ўсё дапамагчы чалавеку, які гатовы там жыць і працаваць. І зробім гэта праз сельскія Саветы, праз кааператывы, скажу прама — прывязаўшы чалавека да зямлі. Нам трэба гэта прааналізаваць. Калі мы выпрацуем механізм, то там, на месцы вызначацца. Чалавек жадае купіць дом, які пустуе? Давайце дапаможам. Адрамантаваць? Пабудаваць? Добра. Але для гэтага мы павінны ў канкрэтнай вёсцы пад кантролем дзяржавы пабудаваць тыпавыя дамы і прапанаваць, каб ведаць, якая цана. Часу для гэтага мала. Увосень мы павінны бачыць гэтыя дамы. Адрэстаўраваны дом, пабудаваны дом, чатырохкватэрны... Вельмі важная праблема. Дамовіліся».

Фота БелТА.

Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы Алена АНІСІМ *нагадала пра 100-годдзе з дня ўтварэння БССР. Гэта значная падзея. Аднак, як адзначыла дэпутат, у сталіцы няма помніка першым дзеячам БССР Змітру Жылуновічу (Цішку Гартнаму), Аляксандру Чарвякову, Усеваладу Ігнатоўскаму: «Можа, варта звярнуць увагу на гэтае пытанне і даць даручэнні па ўсталяванні ім помнікаў?»*

«Вы ведаеце маё стаўленне, — пракаментаваў Прэзідэнт. — Я супраць таго, каб помнікі разбуралі (таму каля Дома ўрада і захоўваецца помнік Леніну, напрыклад). Але я праціўнік і ўзвядзення новых. Таму, вы правільна прыкмецілі, апошнім часам не ствралі помнікаў, калі толькі кіраўнікі замежных краін прасілі. І я іх прашу — напрыклад, ва Узбекістане нядаўна адкрылі помнік нашаму пісьменніку. Не буду падтрымліваць ініцыятывы па ўзвядзенні помнікаў унутры краіны, хоць, напэўна, камусьці трэба. Ёсць чым займацца, акрамя гэтага».

Старшыня пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве Юрый ДАРАГАКУПЕЦ *нагадаў, як у 2006 годзе Аляксандр Лукашэнка падтрымаў грамадзян пры газіфікацыі магчымасцю льготнага крэдытавання. Хутка будзе запушчана Беларуская АЭС. У сувязі з гэтым людзей, асабліва сялян, хвалюе, ці магчыма аказаць такую дапамогу насельніцтву пры электрыфікацыі жылога фонду на патрэбы ацяплення і гарачага водазабеспячэння.*

(Заканчэнне на 4-й стар.)